ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 9 (910) | Серада, 22 мая 1996г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## АСПІРАНТАМ -- СОРАСАЎСКІЯ ГРАНТЫ

У пачатку бягучага года Міжнародная Сорасаўская праграма адукацыі ў галіне дакладных навук у Беларусі аб"яўляла конкурс па падпраграме "Сорасаўскія аспіранты".

Падведзены вынікі гэтага спаборніцтва паміж маладымі даследчыкамі. Сорасаўскіх грантаў удастоены і чатыры прадстаўнікі нашага універсітэта -- Вадзім Сelькін, Васіль Сафонаў, Наталля Жаўнова з кафедры алгебры і геаметрыі, Святлана Жогаль (кафедра матэматычных праблем кіравання). Варта адзначыць такі цікавы факт: навуковым кіраўніком першых трох аспірантаў з"яўляецца адзін чалавек. Гэта доктар фізіка-матэматычных навук А.М.Скіба.

Названыя пераможцы конкурсу штомесячна будуць атрымліваць матэрыяльную падтрымку ў доларах для далейшага развіцця сваіх даследчых і інтэлектуальных здольнасцей.

**Т.ДУБЯК.**

## ПЕРШАЯ АБАРОНА Ў ФІЗІКАЎ

Рашэннем Вышэйшай Атэстацыйнай Камісіі Рэспублікі Беларусь пры нашым універсітэце створаны 4 спецыялізаваныя саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Адбылася першая абарона кандыдацкай дысертацыі па спецыяльнасці "Оптыка". Выпрабаванне трымаў выпускнік універсітэцкай аспірантуры Я.Г.Стaрадубцаў (навуковыя кіраўнікі -- доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар А.М.Сердзюкоў і кандыдат фізіка-матэматычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Г.С. Міцюрыч). Ён бліскуча абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Асаблівасці распаўсюджання электрамагнітных хваляў фотаакустычнага пераўтварэння ў гіратропных крышталях звышрашотак".

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ САВЕТ

ВАК Рэспублікі Беларусь зацвердзіла савет па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук па беларускай мове на філалагічным факультэце нашага універсітэта.

Старшынёй савета зацверджаны прафесар кафедры беларускай мовы ГДУ доктар філалагічных навук, прафесар У.В. Анічэнка, яго намеснікам -- прафесар кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, доктар філалагічных навук Р.М.Казлова. Абавязкі вучонага сакратара ўскладзены на загадчыка кафедры беларускай мовы дацэнта А.А.Станкевіч.

У савет па абароне дысертацый увайшлі загадчык аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, член філіяла кафедры беларускай мовы Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны доктар філалагічных навук, прафесар А.М.Булыка, дэкан філалагічнага факультэта У.Д.Еўтухоў, дацэнты кафедры беларускай мовы ГДУ В.А.Ляшчынская, А.А.Парукаў, загадчык кафедры беларускай культуры універсітэта дацэнт Д.Д. Паўлавец, загадчык кафедры беларускай мовы Мазырскага педагагічнага інстытута дацэнт А.К.Малюк.

Першая абарона кандыдацкіх дысертацый ў новым савеце адбудзецца ў хуткім часе.

## ПЕРАМОЖЦЫ СОРАСАЎСКАГА КОНКУРСУ

Беларускі Фонд Сораса аб'явіў пераможцаў конкурсу "Экалагічная адукацыя школьнікаў", які праводзіўся ў рамках праграмы "Экалогія". У конкурсе ўдзельнічала 76 праектаў. 18 з іх прызнаны пераможцамі. Сярод пераможцаў і праект нашага універсітэта "Экалогія-96". Стварэнне і арганізацыя работы вучэбна-метадычнага і інфармацыйнага цэнтра ў Гомелі".

Агульная сума фінансавай падтрымкі, выдзеленая праектам-пераможцам, склала 50125 долараў.

## УШАНАВАЛІ ВЕТЭРАНАЎ

Усё менш і менш застаецца ў калектыве нашага універсітэта тых, хто са зброяй у руках абараняў Айчыну ад гітлераўцаў. У ветэранскай арганізацыі на сённяшні дзень іх налічваецца нямногім больш за 40 чалавек. І аб кожным з іх праяўляецца пастаянны клопат з боку адміністрацыі і грамадскіх арганізацый. Сведчаннем таму стала і 51-я гадавіна Вялікай Перамогі. У гонар гэтай даты быў арганізаваны святочны "Агеньчык". Абаронцаў Радзімы цёпла вітаў рэктар універсітэта член-карэспандэнт Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, прафесар Л.А.Шамяткоў, іншыя кіраўнікі нашай вышэйшай навучальнай установы.

Ва ўрачыстай абстаноўцы ветэранам была аказана матэрыяльная дапамога. І прыемна было бачыць, што ветэраны не старэюць душой.

## *З УЗНАГАРОДАЙ!*

***За шматгадовую, плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК СКОРАВА Аляўціна Аркадзьеўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.***

# ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ НАВУКОВЫХ ЧЫТАННЯЎ--96

**Пераможцамі конкурсу на лепшую навукова-даследчую працу і лаўрэатамі Скарынаўскіх навуковых чытанняў 1996 года ў нашым універсітэце сталі:**






***ВАЛЕТАЎ Валянцін Васільевіч*** -- доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін. Цыкл прац "Экалогія і прадукцыя балотных экасістэм". Адзначаны даследчы напрамак накіраваны на рашэнне праблемы практычнага забеспячэння грамадства ў аднаўленай расліннай сыравіне, рэалізацыі канцэпцыі рацыянальнага прыродакарыстання, эфектыўнай аховы і кіравання экалагічнымі сістэмамі. Даследаванні былі прысвечаны ўстанаўленню біяпрадуктыўнага ўзроўню натуральных і асушаных балотных экасістэм, як лясных так і бязлесных, тлумачэнню заканамернасцей фарміравання фітамасы і пярвічнай прадукцыі ў аспекце ўсіх відавых папуляцый батанічных і экалагічных груп раслін і ярусаў. Асаблівая ўвага ўдзялялася ўзаемасувязі рэжыму ўвільгатнення балот як дамінуючага экалагічнага фактара балотнага асяроддзя, з велічынёй пярвічнай прадукцыі і яе структурай. У выніку складзены уніфікаваныя табліцы, якія дазваляюць вызначаць біяпрадукцыйныя і біяметрычныя характарыстыкі, выкарыстоўваючы толькі таксацыйную ацэнку дрэвастою. Гэтыя распрацоўкі выкарыстоўваюцца ў практыцы і навуковых даследаваннях. Значная ўвага ўдзелена пытанням антрапагеннай трансфармацыі расліннасці ў Гомельскім рэгіёне.

***ЗЯЛЁНЫ Валерый Пятровіч*** -- кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры оптыкі. Цыкл прац "Фотаакустычнае пераўтварэнне ў гіратропных і п"езаэлектрычных крышталях". Прадстаўляемы цыкл уключае вынікі, апублікаваныя ў больш чым 30 навуковых працах у розных выданнях СНД і за рубяжом. Далёка не поўны пералік рошаных задач выглядае наступным чынам: развіты метад п"езафотаакустычнай спектраскапіі лінейных і нелінейных гіратропных п"езаэлектрыкаў вышэйшых і сярэдніх сінгоній. Даследаваны рэзанансныя з"явы і азначаны ўмовы іх існавання. Прапанаваны метад вызначэння ўяўнай часткі параметра гірацыі па эксперыментальнаму вымярэнню амплітудных характарыстык фотаакустычных сігналаў, адпавядаючых правай і левай колавым палярызацыям падаючага выпраменьвання. Абгрунтавана магчымасць азначэння кампанента тэнзара нелінейнага п"езаэфекта фотаакустычным метадам.

***КАЛУГІН Аляксей Савельевіч*** -- доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін. Праца "Фізіялагічныя заканамернасці рухальных рэакцый кішэчніка ў чалавека і жывёлін у працэсе адаптацыі арганізма да розных умоў жыццядзейнасці". Асноўныя палажэнні работы апублікаваны ў манаграфіі, у 5 артыкулах і ў 2 дэпаніраваных рукапісах і шэрагу выступленняў на канферэнцыях. На падставе глыбокага аналізу рухальнай актыўнасці кішэчніка ў эксперыменце і клініцы аўтар распрацаваў і ўкараніў у практыку 3 віды аперацый. Усе варыянты не толькі апрабіраваны аўтарам, але і ўкаранёны ў іншыя клінікі (Гродна, Днепрапятроўск). Аўтар таксама ў апошнія гады правёў шэраг серый даследаванняў на кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін пры эксперыментальным гіпер- і гіпатэрыозе, а таксама пры ўздзеянні малых доз радыяцыі (5 Кі/км$^2$) праз 3 гады пасля катастрофы на ЧАЭС. Гэта дазволіла не толькі даказаць парушэнне маторыкі кішэчніка ў эксперыментальных жывёлін, але і даць абгрунтаванне і рэкамендацыі гэтай паталогіі.

***СТАРАВОЙТАЎ Аляксандр Паўлавіч*** -- кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры матэматычнага аналізу. Цыкл прац "Рацыянальная апраксімацыя дыферэнцыруемых функцый" прысвечаны праблеме, якая была пастаўлена на Міжнародным кангрэсе матэматыкаў у Маскве (1966 г.) савецкім матэматыкам А.А.Ганчаром. Гэта праблема звязана з апісаннем мноства бесперапынных функцый, зададзеных на кампакце, для якіх рацыянальная апраксімацыя дае істотны выйгрыш у хуткасці найлепшых набліжэнняў у параўнанні з полінамінальнай (клас Ганчара). Аўтарам упершыню атрыманы істотны зрух у рашэнні праблемы А.А. Ганчара. Даследаванні базіруюцца на фундаментальных выніках у тэорыі функцый С.М. Нікольскага, А.А. Ганчара, А.А. Пекарскага, В.Н.Русака, а прапанаваны ў іх метад даследаванняў з"яўляецца прамым. У 1996 годзе А.П.Старавойтаў атрымаў персанальнае запрашэнне выступіць з дакладам аб сваіх апошніх выніках па тэорыі апраксімацыі на спецсемінары "Тэорыя набліжэння і гранічныя ўласцівасці функцый" у МДУ імя М.В.Ламаносава і спецсемінары ў Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэце. Па дадзенай тэме ў А.П. Старавойтава за апошнія 5 гадоў апублікавана 15 матэрыялаў.

**В.СКРЭЖЭНДЗЕЎСКАЯ,**
**вядучы інжынер**
**СНТІ НДС.**



## НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

# НАВУКА І ПРАКТЫКА -- ПОБАЧ

У г.Гомелі ў рамках Міжнароднай Сорасаўскай праграмы адукацыі ў галіне дакладных навук, яе падпраграмы "Падтрымка прафесіянальных кантактаў" адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя настаўнікаў школ, метадыстаў і выкладчыкаў ВНУ.

На ёй абмяркоўваліся праблемы выкладання біялогіі ў класах з базавым, профільным і паглыбленым узроўнямі вывучэння прадмета. Мэта мерапрыемства дыктавалася неабходнасцю прывядзення ў адпаведнасць з магчымасцямі школы, узроставымі асаблівасцямі навучэнцаў і патрэбамі ВНУ зместу асобных раздзелаў і тэм школьнага курса біялогіі. У канферэнцыі прынялі ўдзел інспектар Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, вядучыя вучоныя, метадысты і настаўнікі школ. Былі таксама прадстаўнікі Акадэміі навук Беларусі, Беларускай акадэміі фізічнага выхавання і спорту, Акадэміі ветэрынарнай медыцыны (г.Віцебск), Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (г.Горкі), Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта, нашага універсітэта, Мінскага гарадскога і абласнога інстытутаў удасканалення настаўнікаў, Гомельскага абласнога інстытута павышэння кваліфікацыі, настаўнікі школ г.г.Гомеля, Добруша, Рэчыцы, Светлагорска, Брэста, Барысава, Віцебска, Магілёва, Гродна.

Пасяджэнне адкрыла акадэмік АН Беларусі, старшыня Кансультацыйнага Савета Міжнароднай Сорасаўскай праграмы адукацыі ў галіне дакладных навук (ISSEP) Л.В.Хатылёва. Яна падкрэсліла, што цяжкасці цяперашняга перыяду могуць стаць сур"ёзнымі складанасцямі ў фарміраванні будучага інтэлектуальнага асяроддзя, знізяць узровень навукі і культуры, і шляхам аказання разнапланавай дапамогі і падтрымкі школам і ВНУ, якую ажыццяўляе праграма, ствараецца спрыяльнае асяроддзе для рэалізацыі творчага патэнцыялу найбольш адораных асоб.

З аналізам якасці ведаў школьнікаў і абітурыентаў выступіла інспектар Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь Г.С.Раманавец. Яна адзначыла значнае месца біялогіі ў праграмах уступных экзаменаў у ВНУ рэспублікі, аднак біялагічныя веды значнай часткі школьнікаў здавальняючыя. Так, вынікі выпускных экзаменаў у школах і ўступных у ВНУ паказалі, што ў цэлым суадносіны адзнак падобныя, і ў тым, і ў іншым выпадку пераважаюць тройкі (40 і 48 %). Прарэктар па навуковай рабоце , Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута М.М.Астрэйка прывёў канкрэтныя дадзеныя па якасці ведаў абітурыентаў сваёй навучальнай установы, зрабіўшы акцэнт на тое, што толькі 40% медалістаў пацвярджаюць выдатную адзнаку па біялогіі. І ў іншых выступленнях прагучала заклапочанасць параўнальна невысокім узроўнем біялагічных ведаў школьнікаў, а таксама недасканаласцю праграм школы і для паступаючых у ВНУ.

Затым на працягу трох дзён на базе лепшых, адзначаных грантам Сораса школ г.Гомеля №№8 і 56, за "круглым сталом" і ў групах пад кіраўніцтвам вучоных -- дацэнта БДПУ О.Р. Александровіч, старшага выкладчыка біялагічнага факультэта ГДУ Т.Ю.Гілеп, дацэнта ГДМІ Л.П. Гаўрылавай, дацэнта БДУ Н.П.Максімавай, дацэнта біяфака ГДУ І.Ф.Расашка, загадчыка кабінета біялогіі Мінскага гарадскога ІУН А.М. Рагожнікава і інш., ішла інтэнсіўная работа ўдзельнікаў па адбору зместу раздзелаў школьнага курса біялогіі, па прывядзенню ў адпаведнасць школьных праграм і для паступаючых у ВНУ.

Вынікам з"явіліся канкрэтныя рэкамендацыі, якія дазваляюць суаднесці аб"ём і глыбіню зместу школьнага біялагічнага матэрыялу з патрабаваннямі ВНУ да ведаў абітурыента і тым самым палепшыць якасць біялагічнай адукацыі ў цэлым па рэспубліцы.

Удзельнікі адзначылі часовасць і практычную накіраванасць канферэнцыі, выказалі глыбокую падзяку дырэктару Праграмы ISSEP А.А.Шубу, прадстаўніку Фонда Сораса В.А.Кедраву, дырэктарам школ №№8 і 56 г.Гомеля С.Рыднаму, А. Вішнеўскаму, настаўнікам Ж.Марчанка, Н.Кароткай, А.В.Маргунову за стварэнне цудоўных умоў для правядзення патрэбнага і цікавага мерапрыемства.

**Т.ВЯРЦЯЧЫХ,**
**метадыст Гомельскага інстытута павышэння кваліфікацыі.**
**І.РАСАШКА,**
**дацэнт біяфака ГДУ.**

# ХТО ЛЕПШ ВЕДАЕ ЗАМЕЖНУЮ МОВУ?

У сённяшнім нашым жыцці добра ведаць замежную мову становіцца прэстыжным. Гэта добра разумеюць і многія студэнты нашага універсітэта, таму з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю ставяцца да яе вывучэння. Гэта пацвердзіла праведзеная нядаўна ў ГДУ міжфакультэцкая алімпіяда па англійскай мове сярод студэнтаў нямоўных спецыяльнасцей.

Удзельнікі алімпіяды паказалі добрую падрыхтоўку. Лепшымі знаўцамі англійскай мовы прызнаны студэнтка гр. Б-12 Вікторыя Шыцікава, якая займаецца ў выкладчыцы С.М.Макравусавай, Ірына Навуменка з гісторыка-юрыдычнага факультэта (выкладчыца Э.Д.Золатава), Юрый Ільін з групы РБ-32 (выкладчыца Н.П.Марозава).

Сярод актыўных удзельнікаў алімпіяды журы адзначыла таксама Алега Кажадуба і Мікалая Галамысава, другакурснікаў фізічнага факультэта (выкладчыца А.Д.Садоўская), а таксама Вольгу Гарэлаву (гр. Б-12, выкладчыца С.М.Макравусава).

Пераможцы і актыўныя ўдзельнікі алімпіяды атрымалі падарункі -- кнігі, а таксама заахвочвальныя прызы -- руска-англійскія размоўнікі.

**Г.ЛОЎГАЧ,**
**выкладчыца кафедры англійскай мовы.**

# "ЮБІЛЕЙНАЯ" НАВУКОВАЯ СТУДЭНЦКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

На факультэце фізічнай культуры прайшла студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 10-годдзю аварыі на Чарнобыльскай АЭС, вынікі якой яшчэ не вызначаны. Згодна справаздач Міністэрства аховы здароўя, няўхільна расце захворваемасць, пагаршаюцца ўсе дэмаграфічныя паказчыкі.

Сёння праблема аздараўлення насельніцтва становіцца важнейшай дзяржаўнай задачай. Асабліва значэнне гэта набывае для дзіцячага кантынгенту, як найбольш ранімай крытычнай групы насельніцтва, якая нясе ў сабе асновы будучага здароўя і дабрабыту нацыі. Таму не выпадкова тэмы дакладаў былі прысвечаны вывучэнню праблем, звязаных з пагаршэннем стану здароўя, рэзкага зніжэння рухальнай актыўнасці, пагаршэння фізічнай падрыхтаванасці і фізічнага развіцця дзяцей.

Аднак змяненне экалагічнага становішча патрабуе не толькі канстатацыі адхіленняў здароўя навучэнцаў, яго негатыўнай узроставай дынамікі, складання банка гэтых дадзеных, але і пошуку рэзерваў здароўя арганізма, які расце, практычнага аздараўлення дзяцей, у тым ліку сродкамі фізічнага выхавання.

Многія спецыялісты-практыкі недаацэньваюць ролю фізічнага выхавання ў аздараўленні дзяцей. Функцыянальныя зрухі, якія адбываюцца ў час выканання практыкаванняў, стымулююць працэсы аднаўлення і адаптацыі, дзякуючы чаму фізічныя практыкаванні пры пэўных умовах служаць моцным фактарам павышэння функцыянальных магчымасцей арганізма і ўдасканалення яго структурных уласцівасцей.

Сярод выступленняў хацелася б адзначыць работы студэнтаў К. Раманава "Даследаванні эфектыўнасці прымянення элементаў спартыўных гульняў на ўроках фізічнай культуры ў пачатковай школе"; С. Фомчанкі "Стан апорна-рухальнага апарата ў малодшых школьнікаў і карэкцыя сродкамі фізічнай культуры"; І.Бобрыка "Даследаванні ўплыву мадыфіцыраваных урокаў фізічнай культуры на арганізм навучэнцаў 5-х класаў".

Вынікі прадстаўленых даследаванняў могуць быць рэкамендаваны настаўнікам-практыкам. Ёсць падставы канстатаваць, што студэнты поўнасцю авалодалі навыкамі сучасных методык даследавання, а, значыць, у хуткім часе будуць атрыманы новыя навукова-практычныя дадзеныя, на аснове якіх пачнуць ствараццa метадычныя рэкамендацыі па правядзенню фізкультурна-аздараўленчай работы ў агульнаадукацыйных школах і спецыяльных установах, дзе займаюцца аздараўленчымі і рэабілітацыйнымі мерапрыемствамі. У канчатковым выніку гэта дазволіць значна паменшыць колькасць дзяцей, маючых адхіленні ў стане здароўя.

У рабоце канферэнцыі прымалі таксама ўдзел аспіранты і выкладчыкі нашага факультэта, якія актыўна займаюцца навукова-даследчай работай.

Падводзячы вынікі канферэнцыі, загадчыкі кафедр кандыдаты педагагічных навук Г.І.Нарскін, М.Г.Кошман, М.В.Каняхін, дацэнты В.І.Кузняцоў, У.М.Старчанка, нам. дэкана М.А.Кульбакоў адзначылі ўзросшы якасны ўзровень праведзеных даследаванняў, іх практычнае значэнне, унеслі новыя арыгінальныя ідэі па рэарганізацыі структуры правядзення канферэнцыі, прыцягнення вялікай колькасці студэнтаў факультэта фізічнай культуры да навукова-даследчай работы.

**Т.БАРАНАВА,**
**аспірантка кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры.**

※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※※

## СТЫПЕНДЫЯ ПРАФСАЮЗА

Адбылося пасяджэнне Прэзідыума Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, на якім сярод іншых пытанняў парадку дня прыняты праект Палажэння аб стыпендыях прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Стыпендыі прафсаюзаў будуць прысуджацца студэнтам вышэйшых і навучэнцам сярэдніх спецыяльных устаноў за актыўны ўдзел у жыцці і дзейнасці прафсаюзных арганізацый і высокія дасягненні ў вучобе. На Гомельскую вобласць устанаўліваюцца шэсць стыпендый для студэнтаў ВНУ. Памер стыпендыі -- 100 тыс.руб. Яна ўстанаўліваецца ў выглядзе даплаты да асноўнай стыпендыі. Стыпендыі на адпаведны семестр навучальнага года размяркоўваюцца паміж навучальнымі ўстановамі рашэннямі Рэспубліканскага і абласных камітэтаў прафсаюза, паміж факультэтамі ВНУ -- прафкомамі студэнтаў. Рашэнне аб вылучэнні кандыдатур на прысуджэнне стыпендыі прымаюць прафкомы студэнтаў навучальных устаноў, якім выдзелены дадзеныя стыпендыі па ўзгадненню з саветам навучальнай установы.

(Наш кар.)

## ДЗЯРЖАВА -- ПРАВА -- МОЛАДЗЬ

Камітэт па справах моладзі, Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь правялі нядаўна на базе спартыўнага комплексу "Раўбічы" рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю "Прававое забеспячэнне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі". У ёй прынялі ўдзел лідэры 34-х маладзёжных арганізацый рэспублікі, прадстаўнікі выканаўчых камітэтаў, а таксама госці з Расіі, Украіны, Малдовы, Казахстана і Германіі.

На працягу трох дзён работы канферэнцыі абмяркоўвалася праблема прававога ўзаемадзеяння дзяржавы і маладзёжных аб"яднанняў. З дакладамі, паведамленнямі выступалі вядучыя юрысты рэспублікі, навуковыя работнікі, прадстаўнікі міністэрстваў, іншых цэнтральных органаў кіравання, камісій Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і інш.

Удзельнікі канферэнцыі прынялі рэзалюцыю, у якой выказалі сваю занепакоенасць становішчам спраў у маладзёжным асяроддзі, ходам рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў рэспубліцы: расце беспрацоўе, злачыннасць, бездухоўнасць, што выклікае негатыўныя вынікі, пазбаўляе моладзь будучыні. Нягледзячы на тое, што ў рэспубліцы нямала зроблена ў падтрымку моладзі, студэнтаў, меры, якія прымаюцца дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі без дакладнай каардынацыі, не даюць жаданых вынікаў. Ажыццяўленне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў нашай рэспубліцы будзе найбольш выніковым і эфектыўным пры наяўнасці сродкаў на фінансаванне рэгіянальных комплексных і мэтавых маладзёжных праграм, далейшае развіццё і стварэнне органаў па рабоце з моладдзю ў структурах выканаўчай улады.

З мэтай рашэння гэтых праблем удзельнікі канферэнцыі звярнуліся з канкрэтнымі прапановамі да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Вярхоўнага Савета, Кабінета Міністраў рэспублікі, кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

**Н.КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў,**
**удзельніца канферэнцыі.**



*У час нядаўняга знаходжання групы выкладчыкаў і студэнтаў Франка-беларускага інстытута кіравання ў Францыі загадчык кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці нашага універсітэта У.П.Бабына азнаёміўся з пастаноўкай адукацыі ў гэтай краіне, аб чым і вядзе свой расказ.*

# АДУКАЦЫЯ Ў ФРАНЦЫІ

Яна характарызуецца тут ступеньчатасцю: пачатковая -- да 11 гадоў, сярэдняя -- да бакалаўра. Апошняя мае два ўзроўні. Спачатку вучоба ў каледжы (3-6 класы). Хто вытрымлівае ў ім экзамены, паступае ў ліцэй. Да класічнай адукацыі адносіцца ліцэй агульнай падрыхтоўкі. Ёсць і прафесійна-тэхнічныя ліцэі, па заканчэнні якіх выпускнікі ідуць працаваць або паступаюць у вышэйшую школу.

У Францыі налічваецца 27 акадэмій. Кожная з іх прыпадае на 3-4 дэпартаменты. Іх у Францыі -- 90.

Кожную акадэмію ўзначальвае рэктар. Ён жа з"яўляецца прадстаўніком Міністэрства вышэйшай адукацыі Францыі.

190 гадоў таму ў Францыі быў створаны першы універсітэт. Для універсітэтаў гэтай краіны характэрны тры прыкметы: аўтаномія; шматпрофільнасць (напрыклад, ва універсітэце г. Клермон - Феран ёсць факультэты права, эканамічных навук, медыцыны, фармацыі, зубной хірургіі). Акрамя таго, функцыяніруюць прафесіянальны інстытут, тэхналагічны, па падрыхтоўцы адміністрацыйных кіраўнікоў. І трэцяя прыкмета -- удзел. Гэта азначае, што ўсе работнікі ўдзельнічаюць у выбарах органаў кіравання і выпрацоўцы палітыкі.

Узначальвае універсітэт прэзідэнт, які выбіраецца адзін раз на 5 гадоў. Пры прэзідэнце існуюць тры саветы: адміністрацыйны (30-50 чалавек), які прымае важныя рашэнні, звязаныя з палітыкай універсітэта (навучанне, навуковыя даследаванні, бюджэт, ратыфікацыя пагадненняў), і савет па вучэбнаму жыццю. Апошні з названых саветаў вырашае пытанні методыкі выкладання і выпрацоўкі накірункаў навучання.

Важным структурным падраздзяленнем з"яўляецца навуковы савет. У яго кампетэнцыю ўваходзяць пытанні вызначэння напрамкаў навуковых даследаванняў, размеркавання крэдытных сродкаў на фінансаванне даследаванняў, размеркаванне (прагноз) кадраў па спецыяльнасці.

Ва ўсіх саветах задзейнічаны розныя катэгорыі работнікаў (рэалізуецца прыкмета ўдзелу): 40% -- выкладчыкі, 15% -- дапаможны персанал і 40% -- студэнты. У любы час студэнты і дапаможны персанал могуць аб"яднацца і на сваю карысць прымаць адпаведныя рашэнні.

Структурнымі падраздзяленнямі універсітэтаў з"яўляюцца факультэты і інстытуты. Пры факультэтах функцыяніруе Адміністрацыйны савет, які выбіраецца такім жа чынам і ў тых жа суадносінах, як і на ўзроўні універсітэта. У Адміністрацыйны савет да 10% могуць быць назначаны спецыялісты з боку (спонсары, прадстаўнікі гандлёвай палаты і прафсаюзаў і г.д.). Адміністрацыйны савет выбірае свайго старшыню, які адначасова з"яўляецца і дэканам факультэта. Кіраванне факультэтам ажыццяўляецца на падставе існуючага Статута.

Дэканы маюць права распараджацца фінансавымі сродкамі.

Фінансавыя службы універсітэта, зыходзячы з нарматыву бюджэту на 1 студэнта, вызначаюць па факультэтах суму іх бюджэту. Акрамя гэтага факультэты прыцягваюць фінансавыя рэсурсы за кошт плацяжоў студэнтамі за навучанне, за выкананне навукова-даследчых работ заказчыкамі, за лік паступлення ад прадпрыемстваў таксы (падатак на адукацыю).

Усе сродкі выкарыстоўваюцца па рашэнню адміністрацыі факультэта (расходы па персаналу, ксеракопіі, камандзіроўкі і г.д.). Аплата рахункаў праводзіцца бухгалтэрыяй універсітэта. Пры гэтым пры аплаце ўлічваецца даведзены ліміт бюджэту і законнасць аперацый. Галоўны бухгалтар мае права вярнуць неаплачаным рахунак.

Заработная плата выкладчыкаў у бюджэт факультэта не ўключаецца. Па штатных выкладчыках дзяржавай ўстанаўліваецца памер аплаты, месца і час яе выплаты. Гэта азначае, што заработная плата па штатных работніках вынесена за межы універсітэта.

Калі запрашаецца работнік з боку (пагадзіншчык), то аплата праводзіцца з бюджэту універсітэта.

На факультэтах ёсць свая адміністрацыя (7 адміністрацыйных ставак), у тым ліку тры стаўкі аплачваюцца дзяржавай (адміністратар, два сакратары) і чатыры з уласнага бюджэту, (бухгалтар, тры сакратары).

У Францыі маюцца два віды інстытута. Адны з іх поўнасцю самастойныя і ўваходзяць у сістэму вышэйшай адукацыі. Дырэктар такога інстытута назначаецца міністрам адукацыі. Дзейнічае таксама Адміністрацыйны савет. Яго ўзначальвае прэзідэнт, які вызначае ўсю палітыку, а дырэктар рэалізуе яе ў жыцці. У інстытуце ёсць аператыўны орган, у які ўваходзяць дырэктар, некалькі членаў Адміністрацыйнага савета, работнікі ўпраўлення бягучымі справамі.

Універсітэцкі інстытут узначальвае дырэктар, які выбіраецца Адміністрацыйным саветам, у склад якога ўваходзяць 40 чалавек. Адметнай рысай універсітэцкага інстытута з"яўляецца выбранне ў адміністрацыйны савет ад 30 да 50% людзей (спецыялістаў) з боку, якія могуць аказаць істотны ўплыў на адукацыю з улікам патрэб вытворчасці. Вучэбныя праграмы ў гэтых інстытутах на 80% фарміруюцца Міністэрствам адукацыі, а на 20% -- з улікам прапаноў Адміністрацыйнага савета.

# "НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ ЖЫВЕ ЧАЛАВЕК"

У наш час вельмі часта даводзіцца чуць словы аб тым, што ўсё менш духоўнасці, чалавечай культуры, спагады і міласэрнасці застаецца ў сэрцах людзей. Некалькі год запар не перастае гучаць з экранаў тэлевізараў і дынамікаў радыё папулярнае выслоўе: "Толькі прыгажосць выратуе свет". І гэта сапраўды так. У душы кожнага чалавека жыве адчуванне прыгожага. Чым часцей ён сутыкаецца з прыгажосцю, тым часцей праходзіць катарсіс, своеасаблівае ачышчэнне. Пры гэтым ачышчаюцца, у пэўнай ступені робяцца высакароднымі яго думкі, пачуцці. Таму вельмі важна як мага часцей наладжваць для людзей такія вось спатканні з прыгажосцю.

У гэтым накірунку і працуе народная харавая капэла універсітэта "Дзянніца", мастацкім кіраўніком і дырэктарам якой з"яўляецца Мікалай Аляксандравіч Казлоў.

Рэпертуар капэлы складаюць у асноўным духоўныя песні. Але не толькі яны. Вельмі арыгінальна гучаць у выкананні "Дзянніцы" апрацаваныя народныя песні, а таксама песні вядомых кампазітараў на вершы паэтаў розных часоў.

Студэнты філалагічнага і гісторыка-юрыдычнага факультэтаў мелі магчымасць пачуць цудоўныя спевы капэлы ў сценах роднай "Альма-матэр".

Свой выступ "Дзянніца" распачала песняй-гімнам "Магутны Божа" кампазітара Равенскага на верш беларускай паэткі-эмігранткі Наталлі Арсеньевай. Перад кожнай наступнай песняй Дзмітрый Дзмітравіч Паўлавец, загадчык кафедры беларускай культуры, кандыдат філалагічных навук рабіў кароткія заўвагі, каментарыі ў дачыненні да таго, што прапаноўвалася студэнтам праслухаць. У гэты вечар яны пачулі песні Куліковіча-Шчазлова ("Плотию уснув"), Галія Пікарда ("У Бетлеем за пастушкамі", "Маці Бога Жыровіцкая"), Касалапава ("Утверди, Божа"), Архангельскага ("Воскую имя Божее..."), песню на словы Ф.Абрантовіча "Божа, што калісь", а таксама твор з "Полацкага сшытка" "О, Марыя, Маці Бога" і народную песню "Там каля млына".

На заканчэнні Мікалай Казлоў падзякаваў студэнтам за ўвагу, пажадаў усім прысутным здароўя, якое асабліва будзе патрэбна студэнтам у час надыходзячай сесіі, шчасця і поспехаў на многія гады.

На развітанне капэла "Дзянніца" праспявала вядомую песню "Многія лета".

У сваю чаргу мы хочам падзякаваць капэле за тое, што яна ёсць, што працуе ў рэчышчы духоўнай культуры народа, вяртае да жыцця напаўзабытыя музычныя творы класічнай і народнай спадчыны, за тое, што сваімі песнямі абуджае ў сэрцах людзей парасткі духоўнасці, чалавечай куультуры, чысціні і шмат светлых пачуццяў. Зычым "Дзянніцы" далейшых творчых поспехаў.

**Н.ДЗЕНІСЮК,**
**студэнтка гр. БА-14 філалагічнага факультэта.**

# НА МАТЭРЫЯЛЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

У 1995 годзе ў выдавецтве "Навука і тэхніка" выйшла кніга "Голас з невычэрпнай і жыватворнай крыніцы", складальнікам якой з"яўляецца доктар філалагічных навук, прафесар У.В.Анічэнка. Хочацца выказаць словы ўдзячнасці асабіста Уладзіміру Васільевічу, а таксама выкладчыкам кафедр беларускай мовы і літаратуры, якія прычыніліся да справы ўкладання гэтай кнігі і чые творчыя знаходкі былі выкарыстаны ў працэсе яе напісання. Сярод іх -- У.А.Бобрык, В.А.Гуліцкая, Л.П.Кузьміч. У кнізе таксама быў выкарыстаны матэрыял фальклорнага архіва, які створаны на базе навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры беларускай літаратуры. Тут плённа працуе ў гэтым накірунку дацэнт В.С.Новак.

Першую частку зборніка складаюць высокамастацкія паэтычныя тэксты, пададзеныя з улікам жанрава-тэматычнай класіфікацыі. Так, сюды былі ўключаны наступныя раздзелы: дзіцячы фальклор; юнацкія захапленні, мары, здзяйсненні; шлюбны фальклор; сямейна-бытавыя адносіны; фальклорныя сімвалы; каляндарна-абрадавы фальклор; працоўныя песні; ваенна-патрыятычныя матывы; казацкія прыгоды; песні з няволі; народная словатворчасць (прыказкі, прымаўкі, трапныя выразы і выслоўі). Цікава, што пры падачы тэкстаў улічваюцца таксама рэгіянальныя асаблівасці гучання гэтых твораў у жывой народна-гутарковай мове, а пасля кожнага з іх указаны назвы тых мясцовасцей, дзе яны былі запісаны.

Другая частка кнігі ўяўляе сабой слоўнік незразумелых і малазразумелых слоў, якія ўжываюцца ў прыведзеных раней прыкладах. Тут падаецца лексіка, якая не набыла нарматыўнага выкарыстання ў складзе сучаснай беларускай мовы, але выклікае цікавасць у плане этымалагічнага ўзнаўлення літаратурных яе адпаведнікаў і той ролі, якую яна адыгрывае ў гістарычным развіцці беларускай мовы. У якасці прыкладаў можна прывесці такія словы, як ПОСТОЛ (скураны абутак), ПРОХАЦЬ (прасіць), СУРАЖОНЫ (наканаваны), ПРАЧЫСТО (па-святочнаму) і інш.

Як бачым, матэрыял, змешчаны ў зборніку, цікавы і разнастайны, а таму кніга будзе карысная як для студэнтаў-філолагаў, так і для ўсіх, хто цікавіцца беларускай народнай творчасцю.

**А.КСЯНДЗОВА,**
**студэнтка 3-га курса філалагічнага факультэта.**



# МОЦАРТ І "МІРНЫ" АТАМ

Мы "адзначалі" сумную дату -- 10-годдзе з дня чарнобыльскай трагедыі. Жыцці тысяч людзей былі апалены гэтай чорнай бядой. І таму вельмі сімвалічна, што менавіта ў гэты дзень у рамках Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія" адбыўся канцэрт з твораў вялікага аўстрыйскага кампазітара XVIII ст., творчасць якога належыць усяму свету.

Вольфганг Амадэй Моцарт свой "Рэквіем" напісаў на тэкст каталіцкай памінальнай службы. Яе паходжанне ўходзіць у глыбокае сярэдневякоўе. Вобразы тэксту поўныя містыкі, гэта -- малюнкі жудаснага суда, грознай кары Гасподняй, даравання грэшнікам, трапяткія маленні аб выратаванні, усемагутны і вечны Бог, міласэрны Хрыстос.

Смерць абарвала жыццё Моцарта, калі ён пісаў найбольш вядомую частку -- хор "Lacrimosa" (Слёзная). У хоры дзіўна спалучаюцца лірычная непасрэднасць, цеплыня і сардэчнасць са стройнасцю і прыстойнай строгасцю выражэння. Закончыць работу генія выпала на долю яго вучня і сябра Зюсмайера. Ён выканаў гэтую сваю складаную місію чула і таленавіта.

Упершыню ў Гомелі выкананне гэтага складанага твора адбылося дзякуючы намаганням і энтузіязму калектыву студэнцкага акадэмічнага хора Гомельскага каледжа мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага пад кіраўніцтвам Е.В.Сабалеўскай і сімфанічнага аркестра, мастацкім кіраўніком і дырыжорам якога з"яўляецца В.Д.Краўцоў. А ў гэты вечар за дырыжорскім пультам стаяў Крыстоф Шэфер, вядомы нямецкі дырыжор, якога звязвае з гэтымі калектывамі даўняя дружба.

Мне ўдалося пагутарыць з панам Шэферам. Вось што ён адказаў на мае пытанні:

-- Ці было вам цяжка працаваць са студэнтамі, гэта ж не прафесіяналы?

-- Музыка "Рэквіема" вельмі складаная, але працаваць з хорам і аркестрам было лёгка, таму што яны вельмі добра падрыхтаваны.

-- Крыстоф, вам, канешне, вядома, што 26 красавіка -- дзень памяці ахвяр чарнобыльскай катастрофы. Як вы думаеце, якая з частак "Рэквіема" найбольш блізкая да гэтай падзеі?

-- Так, я ведаю, які гэта дзень. Перш за ўсё, я павінен сказаць, што мне вельмі прыемна дырыжыраваць "Рэквіемам" Моцарта менавіта ў гэты дзень. Для мяне гэта вельмі важна. Многія людзі ў Германіі ведаюць аб гэтай даце. Што датычыцца музыкі, то ў гэтым творы шмат частак. Але найбольш яркім адлюстраваннем трагедыі з"яўляецца трывожная і драматычная частка "Рэквіема" "Confutatis", якая апавядае аб канцы свету. Але ёсць і іншыя часткі "Рэквіема". Яны вельмі аптымістычныя. Напрыклад, "Sanctus" (Святы Божа) або "Hostias" (Ахвяра).

Гэты твор цудоўны, бо ён аб"ядноўвае драму і надзею на будучае.

А потым быў канцэрт... Магу прама сказаць, што нічога больш грандыёзнага ў нас у горадзе я даўно ўжо не чула. У слухачоў у зале слёзы стаялі ў вачах, калі ў час выканання часткі "Lacrimosa" дырыжор абарваў музыку на той ноце, на якой перастала біцца сэрца вялікага кампазітара. У зале была магільная цішыня -- мінутай маўчання ўсе прысутныя ўшанавалі памяць кампазітара і ахвяр вялікай трагедыі Чарнобыля. Канцэрт працягваўся...

"Рэквіем" Моцарта глыбока чалавечны. Сардэчная лірыка спалучаецца ў ім з вялікім драматызмам. Пакуты чалавека, яго адчай і надзея, яго боль -- вось асноўны змест музыкі "Рэквіема", які як нельга больш адпавядаў таму трагічнаму дню.

**А.КАДОЛ,**
**студэнтка 3-га курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**

# "СКАЛЬД" БУДЗЕ ЖЫЦЬ!

У маі, калі студэнцкаму літаратурна-мастацкаму часопісу "Скальд" споўнілася два з паловай гады, перад яго рэдакцыяй -- цяперашнімі філолагамі-пяцікурснікамі -- паўстала пытанне, хто працягне традыцыю, якая так спадабалася студэнтам і выкладчыкам. Сапраўды, за час свайго існавання "Скальд" ператварыўся ў своеасаблівую візітную картку філфака, пазнаёміў шырокую студэнцкую аўдыторыю з творчасцю больш трох дзесяткаў пачынаючых маладых паэтаў, празаікаў, мастакоў. Як кажуць, "свято место пусто не бывает", тым больш, калі размова ідзе аб філфаку. Энтузіясты знайшліся адразу ж. На змену цяперашняй рэдакцыі ў верасні 1996 г. прыйдзе новая поўная творчай энергіі каманда пад кіраўніцтвам студэнтак рускага аддзялення Ларысы Капінскай і Ларысы Шаліхман, якія не так даўно ўзнагароджаны ў ліку іншых аўтараў часопіса ганаровымі дыпломамі "Скальда". "Мы будзем падтрымліваць жыццёвае полымя часопіса на працягу бліжэйшых двух гадоў, -- падзяліліся сваімі планамі Ларысы, -- і, канешне, разлічваем на дапамогу старых сяброў "Скальда" і ўсіх, каму неабыякавы яго лёс".

Аднойчы Антуан дэ Сент-Экзюперы сказаў бессмяротнае выслоўе: "Самая большая роскошь -- это роскошь человеческого общения". Дык няхай у студэнтаў філфака як мага надалей застаецца такая падстава для зносін, як выхад чарговага нумара іх уласнага літаратурна-мастацкага часопіса "Скальд".

**В.БОРТНІК, студэнт 5-га курса філалагічнага факультэта.**

## ЗАПРАШАЕ НЕЗАЛЕЖНЫ ТЭАТР

З творчасцю Незалежнага тэатра, думаецца, знаёмы ўжо многія выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашага універсітэта, якія па вартасцях яе ацанілі.

Заўтра аматараў тэатральнага мастацтва запрашаюць паглядзець тут камедыю Л.Герш "Свабодныя матылькі". Сляпы юнак пакідае дом і вырашае жыць самастойна. Што з гэтага атрымліваецца, вы даведаецеся, калі паглядзіце гэты спектакль.



**У дні "Арт-сесіі. Гомель-96". Прыемныя сустрэчы і знаемствы.**
**Фота У.Чысціка.**

СПОРТ СПОРТ СПРОТ

## УЗНАГАРОДЫ АСПРЭЧВАЛІ АСІЛКІ

У раённым цэнтры Гомельшчыны г.Нароўлі прайшоў буйны Міжнародны турнір па грэка-рымскай барацьбе. У спаборніцтвах вызначыўся студэнт нашага універсітэта ў вагавай катэгорыі да 100 кг Сяргей Геўрасёў. Ён заваяваў вышэйшую ўзнагароду.

**В.МАРЧАНКА.**

Бывае ж такое!

## ДЗІЎНЫЯ ЗАКОНЫ

Заканадаўства ў Злучаных Штатах Амерыкі вельмі заблытанае -- гэта прызнанне амерыканскага друку.

У гэтай краіне разам з агульнадзяржаўнымі (федэральнымі) законамі ёсць мясцовыя законы -- асобных гарадоў, штатаў, тэрыторый. Часам яны носяць мякка кажучы, дзіўны характар.

У горадзе Мэйсан-Сіці (штат Айова) закон прымушае пажарнікаў правесці 15-мінутную трэніроўку і размінку, перш чым адправіцца на тушэнне пажару.

У горадзе Гэры (штат Індыяна) пакаранне атрымлівае кожны, хто садзіцца ў грамадскі транспарт, з"еўшы часнаку. Чатыры гадзіны -- такі там па закону мінімальны тэрмін паміж ужываннем часнаку і з"яўленнем у грамадскім месцы.

У штаце Вірджынія жанчына, якая пажадала наталіць смагу ў бары, павінна піць заказаны ёю напой не бліжэй адлегласці 1,5 м ад стойкі бара. Кранаючы клопат аб выпівохах праяўляе заканадаўства Пенсільваніі: адзін з рэстаранаў абавязвае ва ўсіх рэстаранах і барах заўсёды мець напагатове насілкі.

У г.Джоліеце (штат Ілінойс) жанчына можа аказацца за кратамі, калі ў адным магазіне яна прымерыла больш шасці сукенак і ніводнай не купіла.

Строгія парадкі ў штаце Кентукі. Адзін з законаў не дазваляе тут лавіць рыбу з дапамогай лука і стрэлаў. Другі катэгарычна забараняе жаніцца на бабулі былой жонкі. Трэці дазваляе жанчынам з"яўляцца ў купальніках, толькі маючы ў руцэ прут. У гэтым штаце таксама не дазваляецца, каб асобы рознага полу, не звязаныя шлюбнымі вузамі, садзіліся ў грамадскіх месцах на адлегласці бліжэй 15 сантыметраў адзін ад аднаго.

Падобны закон ёсць і ў горадзе Манро (штат Айдаха). Ён патрабуе, каб у час танца паміж партнёрамі ўвесь час прагледжваўся "прасвет". Парушальнікі хутка выправаджваюцца з танцавальнай залы і штрафуюцца.

У горадзе Чын-Гроуз жыхары, знаходзячыся ў публічным месцы (уключаючы грамадскі транспарт), не маюць права чыхаць, ікаць, шлёпаць дзяцей і кідаць на падлогу ... сякеры.

У Нью-Джэрсі вельмі строга распісана, як трэба паводзіць сябе ў рэстаранах і іншых падобных "кропках". А больш дакладна: нельга чвякаць, сёрбаць суп, вылізваць талеркі і збіраць соус скарынкай, не дазваляецца таксама выціраць рот рукавом. Вось якія строгасці! У горадзе Су-Сент-Мары (штат Мічыган) лічыцца парушэннем грамадскага парадку спроба плюнуць супраць ветру.

У штаце Масачусетс за нашэнне барады кліночкам трэба плаціць падатак. Неплацельшчыкам пагражае пазбаўленне барады ў прымусовым парадку. У Сан-Францыска нядаўна быў адменены закон (які дзейнічаў больш 150 гадоў), па якому кожны ўладальнік мышалоўкі павінен рэгістравацца як "прафесійны паляўнічы".

У Арканзасе караецца кожны, хто няправільна вымаўляе назву штата. У Нью-Йорку забараняецца раскрываць і закрываць парасон у прысутнасці каня. А ў Вашынгтоне існуе катэгарычная забарона падразаць каням хвасты.

На востраве Пэйн (штат Мінесота) да гэтых часоў захоўвае сілу закон, па якім кожны мужчына, які сустрэне карову, павінен зняць перад ёю капялюш.

Нямала ёсць дзіўных законаў і ў штаце Нью-Мексіко. Напрыклад, у горадзе Альбукерке шафёрам таксі забараняецца хапаць і сілай зацягваць кліентаў у свае машыны. У другім горадзе гэтага штата -- Карызова -- закон не дазваляе мужчынам (і жанчынам таксама) хадзіць па вуліцах горада нягаленымі.

**Склаў па матэрыялах выдавецтва "Стэнли энд прэсс" С.ЖАГОРАЎ, заг. кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.**

Калектыў АГЧ выказвае глыбокае спачуванне спецыялісту I катэгорыі **КАНАВАЛАВАЙ** Галіне Рыгораўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў навукова-даследчага сектара выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму інжынеру НДС **СКРЭЖЭНДЗЕЎСКАЙ** Вользе Мікалаеўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 271
Падпісана да друку 20.05.96.